УДК 821.161.3.09
© В.І. Рагаўцоў

ВЕРБАЛЬНЫЯ СРОДКІ КАМІЧНАГА (паводле «Няскончанай драмы» Францішка Аляхновіча)

Статья посвящеиа вопросам изучеиия вербальных средств комического в пьесе Фр. Аляхиовича «Незакоичеииая драма». Рассматрнваются такие вербальные средства создаиия комической экспрессии, как ироиизмы, каламбуры, аитропоимы, сравиеиия, лексические заимствоваиия, архаизмы.

The paper deals with the problems of verbal means of comic expression in Fr. Aljakhnovich's play «Unfinished drama». Verbal means of comic expression include ironisms, pun, anthroponomy, simile, foreign words and obsolete words.

Францішак Аляхновіч – беларускі драматург і тэатральны дзеяч, публіцыст, празаік. У свой час ён быў адным з найбуйнейшых беларускіх драматургаў, які ўпісаў у беларускую драматургію (як і ў беларускую літаратуру пачатку XX стагоддзя ў цэлым) адну з «самых яскравых, непаўторных, своеасаблівых старонак» [Ковель 2001, с. 335].

Вядомы 18 ягоных п'ес [Кажамякін 1996, с. 301]: «На вёсцы», «Бутрым Няміра» (абедзве напісаны ў 1916 г.), «Манька» (1917 г., 2-я рэд. «Дрыгва», 1925 г.), «Базылішк» (1917 г.), «Чорт і Баба», «Страхі жыцця» (1918 г.), «Дзядзька Якуб», «Цені» (1919 г.), «Птушка шчасця», «Няскончаная драма» (1920 г.), «Заручыны Паўлінкі» (1921 г.), «Шчаслівы муж», «Пан міністар» (1922 г.), «Круці не круці – трэба памярці» (1943 г.) і інш.

Многія п'есы створаны на літаратурным і фальклорным матэрыяле [Хрэстаматыя 1997, с. 339]: «Базылішк» (паводле казкі), «Чорт і Баба» (паводле народнага жарту), «Бутрым Няміра» (паводле легенды «Каменная труба» В. Ластоўскага), «Птушка шчасця» (паводле «Камедыі» К. Марашэўскага), «Заручыны Паўлінкі» (як заканчэнне купалаўскай «Паўлінкі»), «Круці не круці – трэба памярці» (па матывах беларускага фальклору).

П'есы Ф. Аляхновіча шырока ставіліся аматарскімі і паўпрафесійнымі калектывамі Заходняй Беларусі, а таксама ў Латвіі, Чэхіі, аднак найбольш – Трупай Галубка [Сабалеўскі 2002, с. 35].

«Няскончаная драма» закончана ў 1920 г., упершыню апублікавана ў 1921 г. у газеце «Беларускі звон». П'еса шмат у чым аўтабіяграфічная. Ф. Аляхновіч, як і галоўны герой твора Васіль, працаваў карэктарам, адначасова займаючыся драматургіяй, разышоўся з жонкай, перажыў смерць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

маленькага дзіцяці Юркі. П'еса ўпершыню пастаўлена ў Мінску на сцэне тэатра-студыі «Абзац» у 1993 г. (рэжысёр У. Савіцкі) пад назвай «Няскончаная драма, або Тры дні з яго жыцця» [Аляхновіч 2005, с. 523].

Найважнейшыя вербальныя сродкі камічнага ў драме наступныя.

1 Іранізмы

Пра іранічнае ўжыванне Ядзькай дзеяслова *прывітацца* сведчаць прэпазіцыйныя часціца-рэдуплікат *ха-ха* і пабочнае слова *мабыць* (са значэннем няўпэўненасці): *Ён* [немаўля] *нічога, маладзец, здароў... во бачыце, які вясёлы: гвалтам хоча выцягнуць ручкі з-пад пялёнак – ха-ха – хоча, мабыць, з вамі* ***прывітацца***. (Да дзіцяці.) *Ну, не трэба, хавай ручкі, тут холадна, змерзнеш...*

Іранічную экспрэсію моўныя адзінкі могуць набываць пры паўторы іх у рэпліцы іншага персанажа: [Ядзька:] *Усё роўна. Каб толькі ўва ўласнай хаце... Там – у бальніцы голадам мораць... Усё толькі чорны хлеб ды капуста... Ды, апрача таго, баюся я гэтага немца доктара... Яму – каб толькі рэзаць!.. Казаў, што яшчэ будзе рабіць аперацыю... А я баюся... я не хачу!.. Ён мяне зарэжа!* [Васіль:] *Ну, вось табе! «**Зарэжа»!** Доктар не зарэжа. Ён ведае, што трэба...* Прыём мімезісу (паўтор кампанента *зарэзаць*, ужытага Ядзькай) сведчыць, што Васіль іранічна ставіцца да яе слоў. Пацвярджаецца гэта фрагментам Васілёвай рэплікі: *Доктар не зарэжа. Ён ведае, што трэба...* Паказчыкам іранічнай інтанацыі, з якой Васіль вымаўляе *зарэжа*, з'яўляецца (у пісьмовым маўленні) двукоссе.

Прагатыпы мімезісных рэдуплікатаў могуць быць імпліцытна не выражаныя: [Ядзька:] *А тут якраз Паўліна, як з неба звалілася... «Няхай – кажа – прыйдзе* [Васіль] *заўтра да майго мужа, дык дастане добрую службу» – а ён не хоча!..* (Іранічна.) ***«Беларускія справы»! «Часу не маю»!..*** *Нябось, цябе твае гэтыя* ***беларускія справы*** *не накормяць!* Сказы «*Беларускія справы»!, «Часу не маю»!..*, вымаўленыя з іроніяй (паказчык – рэмарка *іранічна*), – гэта раней выказаныя словы Васіля (дарэчы, як фрагменты чужога выказвання яны ўзяты ў двукоссе). Што ж да паўторна ўжытага спалучэння *беларускія справы*, то яго іранічная экспрэсія выяўляецца з дапамогай актуалізатара (не) *накормяць* '(не) забяспечаць неабходным для пражыцця'.

Як самаіронія ўспрымаюцца ў рэпліцы Васіля, які «*смяецца неўрастэнічна*», словы *беларускі паэт.* Сведчаннем гэтага з'яўляецца трыплікаваны выклічнік, ужыты ў пачатку і канцы рэплікі: *«Ха-ха-ха! Жонка хворая ляжыць на бярлогу з галодным дзіцянём у халоднай хаце, прыяцель пайшоў у шулерню, каб дабыць пару марак, а тут вось перад пагасшай печкай той, хто маніцца новы шлях церабіць у заглохшым гушчары –* ***беларускі паэт!..*** *Ха-ха-ха!..»*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пра тое, што ў словазлучэнне *пасмяротнага памятніка* Костусь укладвае іранічны сэнс, сведчыць трыплікаваны постпазіцыйны гукапераймальны выклічнік *ха-ха-ха*: [Васіль:] *Сягоння нас аплёўваюць смехам і абкідаюць каменнямі, а пасля смерці будуць ставіць нам памятнікі…* [Костусь:] *А! вось, куды мы заехалі!.. Гэта ўсё робіцца, значыцца, для* ***пасмяротнага памятніка?*** *Ха-ха-ха…*

Іроніяй прасякнуты словы Костуся, якія маюць дачыненне да Васіля: *«Ха-ха-ха! Настрайваеш свайго сына на беларускі лад? А апазіцыю супакойваеш бутэлькай з малаком?»* Пра гэта сведчыць другая частка прэпазіцыйна ўжытай рэмаркі «Уваходзіць Костусь. Глядзіць з лёгкай *іроніяй* на Васіля», а таксама трыплікаваны гукапераймальны выклічнік *ха-ха-ха!* і словазлучэнне *бутэлькай з малаком.*

Паказчык іранічнага ўжывання дзеяслова *дастане!* – спецыялізаваная прэпазіцыйная рэмарка *іранічна* і разгорнуты постпазіцыйны кантэкст: [Ядзька:] *Не, нічога… усё роўна… Але ён* [Васіль] *цяпер піша нейкую драму. Кажа, што як яе скончыць, дык дастане шмат грошай і здабудзе славу...* [Паўліна (іранічна):] *Але!* ***Дастане!*** *Хто яму дасць? Можа, гэты яго рэдактар Багдзевіч, што сам у дзіравых ботах ходзіць. Э! адзін смех з усяго гэтага…*

Асабліва камічна насычаныя рэплікі, у якіх некалькі іранізмаў. Так, у рэпліцы Паўліны з іранічнай экспрэсіяй ужываюцца прыметнік *добры,* назоўнік *паэт* і спалучэнне *вялікі чалавек.* Вось які дыялог адбываецца паміж Ядзькай і Паўлінай: [Ядзька:] *Не, не кажы гэтак, Паўліна! Ты яго добра не ведаеш. Ён* [муж Васіль] *добры чалавек!* [Паўліна:] *Што з гэтага, што* ***добры****, калі вар'ят… Ха-ха-ха!* ***паэт!*** *Замест таго, каб жыць і працаваць, як усе людзі, ваабразіў сабе, што ён нейкі інакшы чалавек: то таго ён не хоча, то гэтага…* ***Вялікі чалавек,*** *падумаеш!..* (Абнімае Ядзьку.) Іранічная канатацыя прыметніка *добры* актуалізуецца экспрэсіўна зніжаным экспрэсівам *вар'ят*, назоўніка *паэт* – прэпазіцыйным гукапераймальным выклічнікам *ха-ха-ха!*, словазлучэння *вялікі паэт* – дзеясловам *падумаеш!* у значэнні выклічніка (ужываецца для выражэння іроніі).

Васіль у гутарцы з Костусем прызнаецца, што ён верыць у «*адраджэнне свайго народу, як сярэдневяковыя рыцары, ішоўшыя ў крыжавы паход, верылі ў справядлівасць свае справы*». Костусь з іроніяй ставіцца да гэтых слоў, бо, яны, на яго думку, наіўныя, пазбаўленыя жыццёвага грунту: *Дзіця ты! Выгадаванае ў гарадскіх сценах дзіця! Ты не ведаеш народу, ніколь ты не быў на вёсцы. Ідзі на вёску, глянь!* Пра гэта пераканаўча сведчыць іранічна афарбаваны экспрэсіў *дзіця ты!* – 'наіўны, нявопытны чалавек'. Сваю думку Костусь абгрунтоўвае наступнымі словамі: *Папрабуй там казаць аб Беларусі, аб бацькаўшчыне – усе падумаюць, што ты з глузду з'ехаў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

І ніколі не даб'ешся там нацыянальнай свядомасці… Далей у адной з рэплік Костусь іранізуе з Васілёвай веры, якая для яго як той самы наркотык – як для іншых гарэлка, опіум, какаін…: *Ах, ізноў дэкламацыя!.. Згадзіся ж ты са мной, што гэта толькі пустыя словы, фантазія... Ну, але я цябе разумею – гэтая твая* ***"вера"*** *– гэта ёсць патрэбны для твайго жыцця наркотык. Адзін п'е гарэлку, іншы курыць опіум, трэці нюхае какаіну, а ты – хэ-хэ-хэ – маеш сваю* ***"веру"****. І тая толькі розніца між п'яніцай ці какаіністам і табой, што тыя не вымагаюць для сябе пашаны альбо ўдзячнасці ад патомства, а ты хочаш, каб табе – хэ-хэ – паставілі* ***памятнік****… Але нашто? Ці так, ці сяк — памрэш і не будзеш мець магчымасці пахіліць галаву перад сваім* ***разьбяным партрэтам****.* Трыплікаваны гукапераймальны выклічнік *хэ-хэ-хэ* – сведчанне іранічнай ацэнкі Костусем Васілёвай веры, а рэдуплікаваны *хэ-хэ* – актуалізатар іранічнай экспрэсіі назоўнікаў *памятнік* і словазлучэння *разьбяны партрэт.*

Той самы іранізм (*разумны*) у рэпліцы персанажа можа паўтарацца (у другім выпадку ён пашыраецца займеннікам *які* ў функцыі ўзмацняльнай часціцы), ад чаго камізм яшчэ больш узмацняецца: [Васіль (зморшчыўся):] *Не пайду я да гэтага дурня!* [Ядзька (пляснуўшы рукамі):] *Вось маеш табе! Для цябе ўсе дурні, толькі ты адзін* ***разумны!..*** *Людзі самі прыходзяць да цябе з добрым сэрцам, а ты толькі дурні ды дурні. Бач, адзін* ***разумны які!..*** Камічны эфект дасягаецца ўжываннем іранізмаў *разумны* (актуалізатар іранічнага значэння – *толькі ты адзін* [разумны]) і *разумны які!* (паказчык іранічнага ўжывання – *бач, адзін…*).

2 Антрапонімы

З камічным эфектам ужываецца ўласнае асабовае імя *Альфонс* і яго дэмінутыўная форма *Альфонсік*: [Ядзька:] *Э, не! Мне гэтае імя не даспадобы. Юрка – гэта неяк брыдка. Вось каб* ***Альфонс*** *– гэта вельмі прыгожае імя;* [Ядзька (стоячы радам з Васілём пры калысцы, да дзіцяці):] *Смяешся з свайго звар'яцеўшага бацькі! Смейся, бо твой бацька вялікшы за цябе, а такі самы дурненькі, як ты… Ах, ты маленькі мой, бедненькі!* ***Альфонсік*** *мой!* [Васіль:] *Не* ***Альфонсік****, а Юрка!* [Ядзька:] *Не, не Юрка, а* ***Альфонсік!*** Імя *Альфонс* (франц. *Alphonse* – імя героя камедыі А. Дзюма «Масье Альфонс») выклікае камічны эфект, паколькі ў гутарковым маўленні яно ўжываецца як апелятыў са значэннем 'мужчына, які знаходзіцца на забеспячэнні каханкі'.

3 Полісемантычныя каламбуры

У п'есе сустракаецца каламбур, заснаваны на абыгрыванні ў слове прамога і пераноснага значэнняў: [Васіль:] *А вось аб тое й ідзе! Каб не дзіця – даўно б я птушкай* ***паляцеў*** *адгэтуль.* [Ядзька:] *Ну, што ж! Калі так рвешся* ***«ляцець»*** *–* ***ляці!*** *Пакінь мяне з дзіцянём, калі ў цябе няма*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сумлення, – і ***ляці****... Я ведаю, што сэрца ў цябе няма... Дзеля таго ты, мабыць, і службы ніякай не хочаш, што думаеш* ***«ляцець»*** *ад мяне...* Тут абыгрываюцца значэнні полісеманта *ляцець* (ужыты ў розных граматычных формах): прамое ‘рухацца ў паветры пры дапамозе крылаў’ (у рэпліцы Васіля) і пераноснае ‘імкліва пакідаць каго-н.’ (у рэпліцы Ядзькі). З горкім болем у душы ўспрыняла Васілёва жонка намер мужа расстацца з ёю (замінае толькі дзіця). Словы Ядзькі напоўнены адчаем і адначасова сарказмам, пра што сведчаць наступныя сегменты яе рэплікі: *«...Ляці! Пакінь мяне з дзіцянём, калі ў цябе няма сумлення, – і ляці...*; *сэрца ў цябе няма...»*

4 Параўнанні

Насычаны камічны эфект надае выказванню экспрэсіўна зніжанае параўнанне, у якім мужчына параўноўваецца са зласлівай жанчынай: [Костусь (да Васіля):] *Ну, брат, ледзь-ледзь я адваяваў ад упраўляючага апошні наш клумак. Даведаўся, гад, што мы з кватэры ўцякаем, прыляцеў там,* ***як фурыя****, пачаў крычаць, зрабіў страшэнную авантуру. Ну, у канцы канцоў удалося мне яго супакоіць. Я даў расціску, што заўтра ўсё заплоцім.* Тут *фурыя* – перан. разм. ‘злосная і сварлівая жанчына’ [ад імя багіні помсты ў старажытнагрэчаскай міфалогіі].

5 Іншамоўныя ўкрапіны

У сваямоўным вербальным акружэнні яны ўспрымаюцца як чужародныя і, апрача таго, як адзінкі з кніжнай афарбоўкай экспрэсіўна кантрастуюць з некаторымі сваямоўнымі адзінкамі: [Паўліна:] *Вось жа я пра тое, што не трэба рабіць гэтакіх бравэрыяў. Кожны мае сваю* ***idee fixe,*** *але ж не трэба гэта ўсім паказваць, вырываць людзям за сваю* ***idee fixe*** *бараду – ха-ха!..* Параўн.: *idee fixe* (фр. [ідэ фікс]) – ‘назойлівая ідэя’ і *вырываць бараду.*

6 Архаізмы

Камічны эфект выклікае фанетычны архаізм *лётэрыя*. У адпаведнасці з «Беларускай граматыкай для школ» Б. Тарашкевіча [Тарашкевіч 1991. с. 126] чужаземныя словы, якія нядаўна ўвайшлі ў беларускую мову, асабліва навуковыя тэрміны, прапануецца перадаваць на пісьме так, як у мове-крыніцы. Гэта датычыць і назоўніка *латарэя*, запазычанага з італьянскай мовы (іт. *lotteria*). У іншаземных словах на пісьме прапануецца еўрапейскае *l* перадаваць праз *л* мяккае. Як адзначаецца ў «Гісторыі беларускай літаратурнай мовы», *l* еўрапейскае – «сярэдняе», яно не адпавядае ні *л* мяккаму, ні *л* цвёрдаму, а таму змякчэнне яго ў тым становішчы, дзе яно немагчымае па законах беларускай мовы, «непазбежна прыводзіла да штучнасці вымаўлення» [Крамко 1968, с. 168]. Для сучаснага чытача напісанне (і вымаўленне) слова *латарэя* як *лётэрыя* не ўспрымаецца як натуральнае і таму не можа не выклікаць смехавай рэакцыі: [Паўліна:] *Ах,*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

не паверыш, як я зянята, ніколі свабоднай часіны. Вось і цяпер, толькі на адзін мамэнцік... трэба спяшацца... Прасілі мяне, каб я памагла наладзіць дабрачынную ***лётэрыю****. Заўсёды, як якісьці дабрачынны вечар або* ***лётэрыя*** *– да мяне звяртаюцца. Я на гэта майстра...*

7 Комплекснае выкарыстанне вербальных сродкаў камічнага

Ужыванне ў рэпліцы вербальных сродкаў розных тыпаў садзейнічае стварэнню насычанага камічнага эффекту.

1. [Ядзька:] *Гм! Дзіўны чалавек. Прасунуў галаву праз дзверы на адзін мамэнт, каб узяць гарбаты, а паспеў ужо* ***наплесці рознай філасофіі цэлую кучу****... Зусім такі самы* ***з глузду з'ехаўшы,*** *як мой Васіль... Мусіць, ад учорашняй гарэлкі яшчэ не пратрэзвіўся...* Камічную функцыю выконваюць выраз з неадабральнай эмацыйна-экспрэсіўнай афарбоўкай *наплесці рознай філасофіі* – 'нагаварыць абы-чаго, няпраўды' (параўн.: *наплесці* – перан. разм. 'нагаварыць рознага глупства' і *філасофія* – разм. іран. 'абстрактныя, пустыя разважанні'), фразеалагізмы *цэлую кучу* – разм. 'вельмі многа, у вялікай колькасці', *з глузду з'ехаць* – неадабр. 'дзейнічаць неразумна, рабіць глупства'.

2. [Васіль (успамін аб гэтым здарэнні крыху развесяляе яго):] *Але! Гэта было лоўка!* ***Добрая сцэна!..*** *А бо ж раззлаваў мяне гэты гад, што ўжо не ў магату было... Ха-ха!.. Бо ёсць людзі, бачыш, якіх не пераканаеш доказамі слова, але ўдарыўшы палкай па галаве або вытузаўшы за бараду... Тады гэтакі* ***крэпкалобы тып*** *думае сабе: «О, мусі гэта справядлівая справа, калі за яе чалавек так крэпка б'ецца!» Ха-ха!..* Адзін з вербальных сродкаў стварэння камічнага эфекту – іранізм *добрая сцэна!..* Актуалізатары іранічнай канатацыі – фрагменты рэмаркі (*аб гэтым здарэнні*) і Васілёвай рэплікі (*раззлаваў мяне гэты гад, што ўжо не ў магату было... Ха-ха!..*). Сутнасць гэтай «добрай сцэны» выяўляецца ў адной з папярэдніх рэплік Паўліны, дзе згадваецца, што «*нядаўна ў Пшэпёнткоўскіх быў гэтакі палітычны вечар-раўт*», куды запрасілі і Васіля. Калі расселіся піць гарбату, пан Пшэпёнткоўскі дый кажа: «*Уся гэтая беларуская справа – гэта палітычная інтрыга, прыдуманая, каб пасварыць тутэйшае грамадзянства, а гэтыя беларускія дзеячы – людзі пакупленыя»...* Пачуўшы гэтыя словы, Васіль «*ускочыў ад стала, збялеў, як палатно, кінуўся да пана Пшэпёнткоўскага, схваціў яго адной рукой за бараду, а другой махае яму гэтак перад носам і крычыць як ашалеўшы: пан сам – кажа – прадажная душа!*» Камічны эфект выклікае таксама экспрэсіўна зніжаны выраз *крэпкалобы тып* [пан Пшэпёнткоўскі]; параўн.: *тып* – разм. 'чалавек, да якога ставяцца пагардліва'.

3. [Паўліна:] *Ну, дык вось ахрысціце, – папросіш мяне за куму, – і зрабі так, як я казала... Ну, і трэба мне ўжо ісці, спяшаюся да Маневічовай...*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ах, сколькі клопату з гэтай ***лётэрыяй****, ты проста не сцяміш!.. Але нічога не парадзіш. Гэта хрысціянскі абавязак памагаць бедным... Але, ведаеш, іншы раз бывае і весела. Мы – бачыш – дасталі на* ***лётэрыю*** *з аднаго маёнтку жывую свінню. Кожны хоча выйграць гэты фант, бо ж свіння гэта не жартачкі! Нясуць людзі не раз апошнія свае маркі, купляюць білецікі, каб выйграць свінню, а мы робім гэтакае* ***шахэр-махэр,*** *што яе ніхто не выйграе – свіння застаецца да чарговай* ***лётэрыі****...*
Вербальныя сродкі камічнага: архаізм *лётэрыя* (у рэпліцы ўжыты тройчы) і фразеалагізм *шахэр-махэр* (разм. неадабр. 'махлярская здзелка, лоўкая ашуканская аперацыя'); сучаснае напісанне *шахер-махер*.

Вывады

Такім чынам, для стварэння камічнага эфекту выкарыстоўваюцца як спецыялізаваныя вербальныя сродкі (іранізмы, каламбуры), так і неспецыялізаваныя (антрапонімы, параўнанні, іншамоўныя ўкрапіны, архаізмы). У выяўленні іранічнага эфекту важную ролю адыгрываюць актуалізатары – вербальны кантэкст. Комплекснае ўжыванне вербальных сродкаў камічнага садзейнічае стварэнню насычанай камічнай экспрэсіі.

Літаратура

Аляхновіч, Ф. Выбраныя творы / Ф. Аляхновіч; уклад., прадм. А. Сабалеўскага; камент. Г. Кажамякіна і А. Сабалеўскага. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2005. – 544 с.

Кажамякін, Г.В. Аляхновіч Францішак Каролевіч / Г.В. Кажамякін // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск: БелЭн, 1996. – Т. 1. – С. 301–302.

Ковель, У.А. Францішак Аляхновіч / У.А. Ковель // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ-ры імя Янкі Купалы. – 2-е выд. – Мінск: Беларуская навука, 2001. – Т. 1: 1901–1920. – С. 335–357.

Крамко, І.І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы: [у 2 т.] / І.І. Крамко, А.К. Юрэвіч, А.І. Яновіч; рэд. А.І. Жураўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1968. – Т. 2. – 340 с.

Сабалеўскі, А.В. Аляхновіч Францішак Каралевіч / А.В. Сабалеўскі // Тэатральная Беларусь: энцыклапедыя: у 2 т. – Мінск: БелЭн, 2002. – Т. 1. – С. 35–36.

Тарашкевіч, Б. Беларуская граматыка для школ / Б. Тарашкевіч. – 5-е выд. – Вільня, 1929 [факсімільнае выданне: Мінск: Народная асвета, 1991. – 136 с.].

Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі: у 3 т. / уклад., рэд. тэкстаў, уступ. арт. і камент. А.В. Сабалеўскага. – 2-е выд., пашыран. і ўдаклад. – Мінск: Беларуская навука, 1997. – Т. 1: Ад выпокаў – да пачатку ХХ стагоддзя. – 444 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова